# Экалагічнае выхаванне і навучанне ў адукацыйных установах

**К. Д. Варанько,**
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

**Экалагічная адукацыя прадугледжвае бесперапынны працэс навучання, выхавання і развіцця асобы, накіраваны на фарміраванне сістэмы навуковых і практычных ведаў і ўменняў. Яна спрыяе станаўленню і развіццю экалагічнай культуры вучняў, з'яўляецца істотным кампанентам гуманізацыі ўсёй школьнай адукацыі, фарміруе агульнанавучальныя і агульначалавечыя ўменні прагназаваць сваю дзейнасць і дзейнасць іншых людзей, пашырае магчымасці маральнага выхавання ў працэсе навучання.**

Экалагічнае выхаванне і адукацыя падрастаючага пакалення і ўсяго грамадства ў цэлым – адна з галоўных дзяржаўных задач. Важнае месца ў сістэме экалагічнай адукацыі займаюць дашкольная адукацыя і пачатковая школа, якія з'яўляюцца першай прыступкай у фарміраванні адказных адносін дзіцяці да навакольнага асяроддзя і здароўя чалавека. Экалагічнае выхаванне выступае як састаўная частка маральнага выхавання.

Змест экалагічнага выхавання засвойваецца дзецьмі ў дзейнасці. Кожная з формаў арганізацыі навучальнага працэсу стымулюе розныя віды пазнавальнай дзейнасці вучняў: самастойная праца з рознымі крыніцамі інфармацыі дазваляе назапасіць фактычны матэрыял, раскрыць сутнасць праблемы; гульня фарміруе творчыя здольнасці; экалагічныя экскурсіі дазваляюць развіваць адказнасць за паводзіны ў прыродзе. Крытэрыем сфарміраванасці адказных адносін да навакольнага асяроддзя з'яўляецца маральны клопат аб будучых пакаленнях. Праз правільнае выкарыстанне розных метадаў выхавання настаўнік можа сфарміраваць экалагічна кампетэнтную і выхаваную асобу.

У бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» (2010, № 11), які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, змешчаны бібліяграфічны спіс «Экалагічнае выхаванне і навучанне ў адукацыйных установах» (складальнік – К. І. Камендава; навукова-педагагічная бібліятэка Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь). У анатаваны бібліяграфічны спіс уключаны беларускія і выбарачна расійскія выданні (кнігі, артыкулы) на беларускай і рускай мовах за апошнія пяць гадоў па вышэйназначанай праблематыцы, якія будуць карыснымі для педагогаў у плане рэалізацыі задач выхавання экалагічнай культуры. Спіс складаецца з наступных раздзелаў: «Фарміраванне экалагічнай асобы – прыярытэтная задача адукацыйна-выхаваўчай дзейнасці», «Экалагічнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту», «Экалагічнае выхаванне вучняў школ (малодшых школьнікаў, дзяцей сярэдняга і старшага школьнага ўзросту)», «Пазаўрочныя і пазашкольныя формы экалагічнага выхавання», «Экалагічная адукацыя і выхаванне за мяжой».

Літаратура, прадстаўленая ў бібліяграфічным спісе, можа быць выкарыстана спецыялістамі сферы адукацыі, выкладчыкамі, настаўнікамі, выхавальнікамі і ўсімі, каго цікавяць пытанні экалагічнага выхавання і навучання.